**В.М. Сімановіч**
Мінск, Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка

# ПРАБЛЕМЫ НАВУЧАННЯ ШКОЛЬНІКАЎ МАЎЛЕНЧАМУ ЭТЫКЕТУ НА ЎРОКАХ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ

Сучасныя працэсы грамадскага развіцця абумоўліваюць змяненне прыярытэтаў задач адукацыі ў розных галінах ведаў. Усё большае значэнне набывае пошук новых шляхоў навучання і выхавання, скіраваных на развіццё асобы школьніка, на стварэнне ўмоў, якія б садзейнічалі актымізацыі працэсу сацыяльнай адаптацыі школьнікаў, што, у сваю чаргу, даказвае неабходнасць даследавання сферы сацыяльнага ўзаемадзеяння асобы з навакольным асяроддзем, выяўлення яе асаблівасцей і дазваляе вызначыць новыя акцэнты ў змесце адукацыі.

Маўленчы этыкет з’яўляецца значным элементам нацыянальнай культуры і ў якасці яе кампанента стварае спрыяльныя ўмовы для суіснавання і кантактавання людзей, розных па сваім нацыянальным і сацыяльным становішчы, псіхалагічных і ўзроставых асаблівасцях, поглядах і адукацыйным узроўні. У мове, маўленчых паводзінах, устойлівых формулах (стэрэатыпах) маўлення адлюстроўваецца багаты народны вопыт, непаўторнасць звычаяў, складу жыцця, умоў быту кожнага народа. Такім чынам, відавочна, што культура маўленчых паводзін у тыповых сітуацыях этыкетных зносін выступае неабходнай умовай сацыялізацыі школьніка. Не толькі вучні, але і дарослыя рэгулярна сустракаюцца з раз-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

настайнымі тыповымі сітуацыямі этыкетных зносін і з неабходнасцю арыентавацца ў гэтых сітуацыях, адбіраць адэкватныя маўленчыя сродкі і выкарыстоўваць іх у адпаведнасці з агульнапрынятымі нормамі этыкету маўленчых паводзін.

У сучасным грамадстве, якое характарызуецца ўзмацненнем ролі прынцыпаў талерантнасці, чалавек павінен умець дарэчна пачаць размову, не закрануўшы самалюбства суразмоўцы, абараніць сваю пазіцыю ў спрэчцы, не ўплываючы адмоўна на самаадчуванне людзей, пазбегнуць перажыванняў. Таму ўжо са школьнага ўзросту неабходна рыхтаваць дзяцей да ўмелага і ўсвядомленага рэагавання ў тыповых сітуацыях этыкетных зносін.

Вывучэнне беларускай мовы ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі сёння не можа абмяжоўвацца выключна набыццём вузкаспецыяльных ведаў, знаёмствам вучняў толькі з моўнымі адзінкамі і законамі. Абавязак сучаснай школы – сфарміраваць у вучняў уменне правільна карыстацца беларускім словам, дапамагчы ім авалодаць маўленчым этыкетам і культурай зносін. Вывучэнне тэарэтычных і метадычных асноў працэсу навучання маўленчаму этыкету не толькі дазволіць выявіць яго нацыянальна-культурную спецыфіку, але і будзе садзейнічаць асэнсаванню складаных псіхалагічных і педагагічных механізмаў фарміравання культуры маўлення школьнікаў.

Праблема навучання школьнікаў маўленчаму этыкету на ўроках беларускай мовы распрацоўваецца даследчыкамі як з метадычнага боку, так і з лінгвістычнага. У прыватнасці, да яе лінгвістычнага аспекту звярнуліся А.А. Крывіцкі, А.Я. Міхневіч і А.І. Падлужны ў выданні “Белорусский язык для говорящих по-русски” [3]. У кнігу быў уключаны раздзел пад назвай “Моўны этыкет”, у якім сабраны ўсе існуючыя на той час формы вербальных зносін, аб’яднаныя па наступных семантычных групах: зварот, просьба, запрашэнне, падзяка, сустрэча, развітанне, пажаданні, пачуцці, віншаванні, прабачэнні, згода, адмова, пытанні. Гэта фактычна першая спроба семантычнай класіфікацыі адзінак слоўнага этыкету беларускай мовы.

Праблеме маўленчага этыкету як лінгвістычнай і сацыяльнай з’яве прысвечаны працы і іншых усходнеславянскіх лінгвістаў: А.А. Акішынай, А.Г. Балакая, Г.І. Бірулінай, Б.М. Галавіна, У.Я. Гольдзіна, Л.К. Граўдзінай, Л.П. Крысіна, М.Р. Львова, Н.П. Старавойтавай, А.П. Чудзінава, Юй Юань і інш. Аднак у беларускім мовазнаўстве пакуль што няма спецыяльных грунтоўных даследаванняў, прысвечаных дадзенай праблеме. У лінгвістычнай літаратуры існуюць адзінкавыя працы (С.А. Важнік, У.А. Васілевіч, Т.А. Піваварчык, Т.М. Саўчук, Д.С. Томчык), у асноўным даведачнага характару, а таксама некаторыя дапаможнікі па культуры маўлення, у якіх пададзены толькі асобныя назіранні над маўленчым этыкетам.

У методыцы беларускай мовы на праблему навучання маўленчаму этыкету звярнулі ўвагу ў 1990-я гг. Яе распрацоўкай у метадычным плане займаліся І.Э. Саўко, У.П. Саўко, А.В. Солахаў, С.Я. Язерская і інш. Так, у 1988 г. у часопісе “Роднае слова” выйшаў артыкул І.Э. Саўко і У.П. Саўко пад назвай “Калі ласка! Дзякуй! Добры дзень! Да вывучэння тэмы *Маўленчы этыкет*” [4], у якім аўтары падкрэсліваюць значнасць дадзенай праблемы, адзначаюць цяжкасці,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

якія звычайна ўзнікаюць пры арганізацыі навучання маўленчаму этыкету. Асаблівая ўвага звяртаецца на тое, як неабходна пачынаць работу з вучнямі па адзначанай тэме. У артыкуле паказваюцца найбольш частотныя формулы маўленчага этыкету і сродкі іх выражэння. На думку аўтараў, сказы і тэксты, узятыя з твораў мастацкай літаратуры, – лепшая крыніца дыдактычнага матэрыялу да ўрока. У адпаведнасці з такім падыходам у артыкуле прапануюцца некаторыя заданні па адзначанай тэме.

У праграме факультатыўных заняткаў для 5 і 7 класаў па тэмах “Маўленчы этыкет”, “Культура маўленчых паводзін” (аўт. С.А. Язерская) [7] выкладаецца змест курса, ажыццяўляецца прыкладнае яго планаванне, акрэсліваюцца мэты і задачы заняткаў, прапаноўваюцца розныя віды працы, якія можна выкарыстаць на ўроку, прыводзяцца прагназуемыя вынікі заняткаў.

Дапаможнік для настаўнікаў па вывучэнні тэмы “Маўленчы этыкет” С.А. Язерскай уключае шэраг тэм, прысвечаных асновам культуры маўлення [6]. Аўтар вызначае ўмовы паспяховай камунікацыі, класіфікуе формулы ветлівасці, прыводзіць апісанне правільных маўленчых паводзін у розных жыццёвых сітуацыях. У якасці практычнага матэрыялу ў дапаможніку падаюцца практыкаванні, арыентаваныя на вывучэнне формул маўленчага этыкету, аналіз ужывання пэўных этыкем у розных маўленчых сітуацыях. Матэрыялам для большасці практыкаванняў служаць урыўкі з мастацкіх тэкстаў, што спрыяе паралельнаму выхаванню ў чытача павагі да сваёй мовы, роднага краю, традыцый і звычаяў беларусаў.

У выданні А.В. Солахава “Навучанне маўленчаму этыкету. Даведачны матэрыял” [5], акрамя тэарэтычных звестак па тэме, прапанаваны цэлы шэраг практыкаванняў для выкарыстання настаўнікамі на ўроках беларускай мовы, змешчаны таксама заданні для пазакласнай працы па навучанні маўленчаму этыкету.

Пэўная ўвага праблеме навучання маўленчаму этыкету надаецца ў вучэбных праграмах і вучэбных дапаможніках па беларускай мове для вучняў V–XI класаў. Так, спецыяльныя ўрокі па навучанні школьнікаў маўленчаму этыкету адведзены ў 7 і 11 класах. Вывучэнне курса беларускай мовы ў 7 класе пачынаецца з тэмы “Нормы сучаснай беларускай мовы. Маўленчы этыкет”. Асноўная ж увага ў гэтым параграфе адведзена нормам беларускай мовы [1, с. 3−7]. У параграфе змешчаны агульныя звесткі пра культуру мовы, пра ролю маўленчага этыкету ў жыцці чалавека, падаюцца тыповыя правілы вядзення гутаркі. У дапаможніку прыводзяцца таксама асобныя практыкаванні па навучанні маўленчаму этыкету. У першым з іх патрабуецца падабраць словы і выразы, якія спатрэбяцца ў пэўных сітуацыях. Змест практыкавання дазваляе за дастаткова кароткі прамежак часу праверыць веды вучняў, звязаныя з рознымі формуламі маўленчага этыкету. Другое заданне творчага характару: вучні павінны скласці дыялогі, выкарыстоўваючы пэўныя формулы маўленчага этыкету [1, с. 5–7].

У 11 класе школьнікі зноў звяртаюцца да названай тэмы на больш глыбокім узроўні. У дапаможніку змешчаны параграф менавіта пад назвай “Маўленчы этыкет”, які пачынаецца з фармулёўкі правіла, у якім даецца азна-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

чэнне паняццю “маўленчы этыкет”, а таксама ідзе гаворка пра такія формулы маўленчага этыкету, як зварот, прабачэнне, згода, ветлівасць. Акрамя агульнаўжывальных слоў і канструкцый, у дапаможніку цалкам абгрунтавана прыводзяцца адметныя для беларускай мовы формулы: *таечка мая, каляжанкі* і інш. Значная ўвага надаецца структуры і асаблівасцям пісьмовага афармлення віншаванняў. Прапанаваныя практыкаванні вызначаюцца разнастайнасцю і багаццем фактычнага матэрыялу [2, с. 15–19].

Такім чынам, аналіз тэарэтычных і практычных крыніц па вызначаным пытанні паказаў, што распрацоўка праблематыкі маўленчага этыкету, нягледзячы на ўсю яе актуальнасць, у сучаснай навуцы пакуль не з’яўляецца вычарпальнай. У беларускай лінгвадыдактыцы адсутнічае адзіны падыход да вызначэння мэтавых, зместавых, працэсуальных асноў навучання маўленчаму этыкету школьнікаў на ўроках беларускай мовы. На нашу думку, неабходна больш поўна даследаваць стан праблемы навучання культуры маўленчых паводзін (у тым ліку маўленчаму этыкету) у лінгвістычнай і метадычнай літаратуры і назапашаны ў сістэме адукацыі вопыт па навучанні маўленчым навыкам. Важна выявіць асаблівасці і зыходны ўзровень валодання этыкетнай лексікай і навыкамі яе выкарыстання ў школьнікаў, акрэсліць тыповыя віды памылак. Мэтазгодна вызначыць фактары і ўмовы, неабходныя для свабоднага авалодання навыкамі маўленчых паводзін у тыповых сітуацыях маўленчых зносін, а таксама выявіць асноўныя шляхі развіцця этыкетна-маўленчых уменняў і навыкаў вучняў агульнаадукацыйных школ на аснове засваення формул і выразаў маўленчага этыкету.

***Спіс выкарыстанай літаратуры***

1. Беларуская мова : вучэб. дапам. для 7 кл. устаноў агульнай сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / Г. М. Валочка, С. А. Язерская. – 2-е выд., перапрац. і дап. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2015. − 270 с.

2. Беларуская мова : вучэб. дапам. для 11 кл. устаноў агульнай сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / Г. М. Валочка [і інш.]. – 2-е выд., перапрац. і дап. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2016. − 256 с.

3. Кривицкий, А. А. Белорусский язык для говорящих по-русски / А. А. Кривицкий, А. Е. Михневич, А. И. Подлужный. – 3-е изд., перераб. – Минск : Выш. шк., 1990. – 386 с.

4. Саўко, У. Калі ласка! Дзякуй! Добры дзень! Да вывучэння тэмы “Маўленчы этыкет” / У. Саўко, І. Саўко // Роднае слова. – 1998. – № 7. – С. 83–89.

5. Солахаў, А. В. Навучанне маўленчаму этыкету : даведачны матэрыял / А. В. Солахаў. – Мазыр : Выд-ва МДПУ, 2014. – 75 с.

6. Язерская, С. А. Асновы культуры маўлення / С. А. Язерская. – Мінск : Народ. асвета, 2004. – 111 с.

7. Язерская, С. А. Маўленчы этыкет : праграма факультатыўных заняткаў для V класа / С. А. Язерская // Беларус. мова і літ. – 2007. − № 11. – С. 32–35.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ